# ДОБРА І ВЕСЕЛА АДПАЧЫВАЙЦЕ

**(Гутарка менскіх піонераў са старшынёй СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДАМ).**

З'яюць чырвоныя гальштукі. Як дома, адчуваюць сябе піонеры ў зале Совета Народных Камісараў. Тут праходзіць іх гутарка з старшынёй Соўнаркома тав. **Н. М. Галадзедам** аб арганізацыі лагернай кампаніі. Прысутнічаюць наркомасветы тав. **Чарнушэвіч,** прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ і гаркома комсамола.

Навучальны год падыходзіць да канца. Піонеры расказваюць тав. Галадзеду аб сваёй вучобе, піонерскай рабоце, арганізацыі іспытаў у сваіх школах. Тав. Галадзед цікавіцца ўсімі дэталямі школьнага і піонерскага жыцця: як выкладаецца **гісторыя і фізічная геаграфія, як сустрэлі новую пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР** аб школе, **як разгорнута спаборніцтва ў школах, як ажыццяўляецца новы беларускі правапіс.**

Пасля напружанай работы ў школе дзеці павінны разумна адпачыць, каб з новымі сіламі ўзяцца за вучобу. Адзін з асноўных форм адпачынку дзяцей—гэта выезд у лагер. Слаба была арганізавана лагерная кампанія ў мінулым годзе. Дзеці ўказваюць на рад недахопаў.

...даўна прыехала з Артэка (Крым) і што многа карыснага і цікавага з гэтай усесаюзнай здраўніцы трэба перанесці ў лагеры БССР.

Самы галоўны недахоп, на што больш усяго скардзяцца дзеці — гэта дрэнны падбор важатых і фізкультурных работнікаў для лагераў.

Кіраўнік піонерскай арганізацыі БССР тав. **Рутэнберг** знаёміць прысутных з падрыхтоўкай да лагернай кампаніі ў гэтым годзе. 20 тысяч піонераў і школьнікаў Беларусі будуць ахоплены 70 лагерамі (з іх 3. 600 дзяцей Менска). Значна лепш чым у мінулым годзе ідзе падбор месц для лагераў, якія павінны знаходзіцца ўрачом, які адпавядаюць усім патрабаванням для адпачынку і аздараўлення дзіцячага арганізма. Без заключэння ўрача півоадзін раён не мае права вывазіць дзяцей у лагер.

У кожным раёне арганізаван семінарый для важатых, якія будуць працаваць у лагеры. Таксама рыхтуюцца кадры важатых, для работы з дзецьмі, якія застаюцца ў горадзе.

Гэта пытанне асабліва адносіцца да комсамола, які павінен правільна арганізаваць адпачынак дзяцей. **Трэба, каб начальнік лагера прадумаў кожную мінуту дня, усё жыццё лагера да драбнейшай дэталі.**

У лагеры зусім новая абстаноўка.. Піонеры пераключаюцца на агульнае жыццё. Тут могуць сустрэцца дзеці з рознымі нахільнасцямі, з розным выхаваннем. Лагер —сродак вылечвання асобных адмоўных бакоў некаторых піонераў. **Лагер павінен з'явіцца лепшым агульнажыццём дзе-б элементы лепшых выхаваных вучняў пераматлі і прывіваліся усім лагернікам.**

**Дысцыпліна і арганізаванасць павінна праяўляцца ва ўсім лагерным жыцці.**

Не менш важнае пытанне ў лагеры набываюць **беражлівыя адносіны да лагернай маёмасці.** Памяшканне трэба трымаць у чыстаце, абсталяванне не псаваць, глядзець, каб нічога ў лагеры не прападала, каб піводная чашка не была паламана. **Піонеры павінны ўступіць у спаборніцтва на леп-**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы